4. Словарь иностранных слов / под ред. Ф. Н. Петрова (гл. ред.) И. В. Лехина [и др.]. – Изд. 6-е, перераб. и доп. – М. : Сов. энцикл., 1964. – 784 с.

5. *Флиер, А.* Культурология как образование: проблемы формирования культурной компетентности личности / А. Флиер // Культурология для культурологов / А. Флиер. – М. : Акад. проект, 2000. – С. 88–116.

**В. У. Рагачова,**
*дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ АРГАНІЗАТАРАЎ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сацыяльна-культурныя трансфармацыі ў грамадстве змянілі патрабаванні да кампетэнтнасці арганізатара сацыяльна-культурнай дзейнасці як стваральніка і пасрэдніка пры перадачы ідэй, каштоўнасцей і норм культуры. Таму ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі на рынку працы спецыялісту з традыцыйнай сацыяльна-культурнай падрыхтоўкай становіцца ўсё складаней знайсці сябе ў прафесійнай супольнасці. Такім чынам, УВА культуры і мастацтваў павінны падрыхтаваць спецыялістаў, якія будуць адпавядаць узроўню развіцця сучаснага грамадства, стануць актыўнымі ўдзельнікамі сацыяльна-культурнага працэсу. На першы план выйшла праблема фарміравання прафесійных кампетэнцый спецыяліста яшчэ на этапе навучання ва УВА як першай ступені прафесійнага станаўлення.

Сёння ў навуковай літаратуры існуе вялікая колькасць трактовак тэрміна «кампетэнтнасць» (У. І. Байдэнка, Г. І. Ібрагімаў, А. М. Новікаў і інш.). Аналізуючы вопыт навукоўцаў, можна казаць аб тым, што прафесійныя кампетэнцыі – гэта здольнасць і гатоўнасць дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннямі справы, метадычна арганізавана і самастойна вырашаць задачы і праблемы, а таксама самастойна ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці. Гэта звязаныя са спецыяльнасцю навыкі – адпаведныя метадычныя і тэхнічныя прыёмы, уласцівыя розным галінам [1]. У кантэксце нашага праблемнага поля – навыкі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Прафесійныя кампетэнцыі характарызуюць валоданне спосабамі сумеснай дзейнасці і супрацоўніцтва, прынятымі ў

прафесійнай супольнасці. Спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці – гэта прафесія, якая мае дачыненне да групы «чалавек–чалавек», таму ўменні выкладаць думкі, пераконваць, аргументаваць, аналізаваць, выказваць меркаванні, перадаваць інфармацыю, усталёўваць міжасобасныя сувязі, выбіраць аптымальны стыль зносін у розных сітуацыях, арганізоўваць і падтрымліваць дыялог з'яўляюцца базавымі ў станаўленні прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў.

У сувязі з гэтым асноўная мэта пры фарміраванні прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў СКД – гэта пераадоленне розніцы паміж тым, што студэнт ведае, і тым, што ён робіць. Па-іншаму гэта можна сфармуляваць як пераадоленне разрыву паміж тэорыяй магчымых дзеянняў (ведамі) і практыкай (самой дзейнасцю). Гэта своеасаблівае навучанне дзеяннем, якое разумеецца як структураваны працэс вывучэння ўласнага вопыту рашэння рэальнай задачы, праблемы. Падрыхтоўка спецыялістаў СКД будуецца на шырокім выкарыстанні актыўных форм вучэбнай дзейнасці: трэнінгаў, майстар-класаў, круглых сталоў, семінараў і дзелавых гульняў, мэта якіх заключаецца ў практычным засваенні студэнтамі камунікатыўных навыкаў.

Так, на такіх дысцыплінах, як «Узроставыя (дыферэнцыраваныя) тэхналогіі СКД», «Метады даследавання ў СКД», «Тэхналогіі СКД» і інш., выкладчыкі ствараюць умовы, пры якіх студэнты працуюць над рэальнымі задачамі, а не над практыкаваннямі або штучнымі сітуацыямі. Часцей за ўсё выкарыстоўваюцца рэальныя сітуацыі з практыкі арганізацыі вольнага часу, у выніку рашэння якіх студэнты набываюць прафесійна-функцыянальныя практычныя веды і ўменні.

Таксама важным аспектам у арганізацыі вучэбнай дзейнасці з'яўляецца тое, што студэнты вучацца не толькі ў выкладчыка, але і адзін у аднаго. У працэсе сумеснай дзейнасці яны атрымліваюць магчымасць абмену вопытам, што значна пашырае спектр іх прафесійных кампетэнцый. У рамках круглых сталоў па канкрэтных праблемах і майстар-класаў студэнты працуюць з рознымі відамі інфармацыі для прыняцця рашэнняў у кантэксце рэальных прафесійных сітуацый.

Вялікая роля ў фарміраванні прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў СКД па-ранейшаму належыць педагогу. Менавіта ён арганізуе супрацоўніцтва студэнтаў; падтрымлівае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыскусіі, выступае ў якасці каталізатара зносін. Ён забяспечвае хуткую зваротную сувязь, улічвае разнастайнасць здольнасцей і стыляў навучання. Выкладчык надае ўвагу развіццю не толькі інтэлектуальных якасцей, але і развіццю характару, павазе да ўласнага погляду на свет і інш. Без гэтага нельга падрыхтаваць высокакваліфікаванага спецыяліста, здольнага самастойна ставіць і вырашаць прафесійныя задачы.

Такім чынам, неабходна адзначыць, што фарміраванне і ўдасканаленне прафесійных кампетэнцый спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы – гэта складаны і шматаспектны працэс, які забяспечвае эфектыўнае выкананне прафесійных, сацыяльных і асобасных функцый і які мае сэнсажыццёвае значэнне для чалавека. Аналіз практычнай дзейнасці выпускнікоў УВА дазваляе выказаць упэўненасць у тым, што пры падрыхтоўцы спецыялістаў неабходна забяспечваць глыбокую інтэграцыю іх кваліфікацыйнай падрыхтоўкі і асобаснага развіцця, што з'яўляецца зыходнай умовай фарміравання прафесійных кампетэнцый спецыялістаў СКД.


1. *Зимняя, И. А.* Компетентностный подход. Каково его место в системе современных подходов к проблемам образования? (теоретико-методологический аспект) / И. А. Зимняя // Высшее образование сегодня. – 2006. – № 4. – С. 20–27.

2. *Хуторской, А. В.* Ключевые компетенции как компонент личностно ориентированной парадигмы / А. В. Хуторской // Народное образование. – 2003. – № 2. – С. 58–64.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Е. С. Сочнева,** *аспирант кафедры*
*педагогики социокультурной деятельности*

## КОМПЕТЕНТНОСТНЫЙ ПОДХОД К ФОРМИРОВАНИЮ СЕМЕЙНОЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ

Формирование компетентностей студентов в семейной культуре обусловлено реализацией не только обновленного содержания образования, но и адекватных методов и технологий обучения. Под ключевыми компетенциями в процессе формирования семейной культуры студенческой молодежи мы понимаем компетентности относительно: